# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist



## Янош М. БАК

## Янаш М. БАК

## Janos M. BAK

Вучні і настаўнікі – для навуковай антрапалогіі гэта відавочная рэчаіснасць. У нямецкай акадэмічнай культуры XIX–XX стст., а ў значнай ступені і цяпер адносіны паміж вучнямі і настаўнікамі вызначаюцца сямейнымі канатацыямі (*прафесар-бацька*), на іх аснове складаюцца пакаленні навуковых школ. Самым пачэсным лічыцца быць першым вучнем, які нібыта адкрывае спіс навуковага «клана», і апошнім, які завяршае яго слаўную гісторыю.

Ва ўзросце 91 года 18 чэрвеня 2020 г. пайшоў з жыцця венгерскі медыявіст, крыніцазнаўца, спецыяліст па кампаратыўнай гісторыі Цэнтральнай Еўропы, заснавальнік Цэнтра даследаванняў Сярэдневякоўя Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта (*Department of Medieval Studies*, *Central European University*) у Будапешце, стваральнік і доўгагадовы старшыня Асацыяцыі медыявістаў Цэнтральнай Еўропы Янаш Бак – навуковец, які лічыў сябе апошнім вучнем Персі Эрнста Шрама (*Percy Ernst Schramm*).

Творчы шлях Я. Бака пераплецены з яго асабістым жыццём. Лёс навукоўца складваўся не надта проста, палітычныя падзеі ў яго краіне значна паўплывалі і на яго прафесійнае ўдасканаленне. Дзяцінства Янаша Бака праходзіла ў Венгрыі ў ваенныя гады. Ён быў сведкам нараджэння венгерскага камунізму, у якім расчараваўся пасля падзей Венгерскай вясны 1956 г. Янаш Бак вымушана эміграваў у Германію, а пазней у Паўночную Амерыку. Потым было вяртанне на радзіму, якая заўсёды заставалася для гісторыка той зямлёй абяцанай, дзеля славы якой ён не спыняў сваю творчую

CC BY NC

працу. Менавіта тут, у Будапешце, Я. Бак рэалізаваў свае ідэі пра навуковую супольнасць даследчыкаў Цэнтральна-Еўрапейскага рэгіёна і заснаваў Цэнтр даследаванняў Сярэднявякоўя ў Цэнтральна-Еўрапейскім універсітэце.

У 1956 г. Я. Бак адразу паступіў у аспірантуру славутага Гётынгенскага ўніверсітэта, дзе атрымаў доктарскую ступень (навуковы кіраўнік – П. Э. Шрам). Падчас падрыхтоўкі навуковай работы Я. Бак меў магчымасць вывучаць крыніцы па венгерскай сярэдневяковай гісторыі ў Оксфардзе. Навуковая і выкладчыцкая дзейнасць у Германіі ў 1960-х гг. дазволіла засяродзіцца на гісторыі еўрапейскага Сярэднявякоўя, а таксама на лацінскіх тэкстах, міждысцыплінарнай метадалогіі ў вывучэнні гісторыі цэнтральнаеўрапейскіх дзяржаў, злучыць розныя метадалагічныя падыходы ў даследаванні еўрапейскай гісторыі, сацыяльна арыентаваны наратыў і абсалютную павагу да крыніцы. У Марбургскім універсітэце была выдадзена праца Я. Бака, прысвечаная маёмасным адносінам у Венгрыі Позняга сярэднявякоўя.

Амерыканскі перыяд навуковай і выкладчыцкай дзейнасці венгерскага гісторыка распачаўся ў 1966 г. Я. Бак працаваў ва ўніверсітэтах ЗША і Канады. Ён атрымаў званне прафесара ва Універсітэце Брытанскай Калумбіі ў Ванкуверы. Менавіта там пачынаецца арганізатарская дзейнасць навукоўца, калі яго венгерскія калегі і іншыя даследчыкі сярэдневяковай гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы паступова пачалі далучацца да канферэнцыйнага руху, аб'ядноўвацца ў асацыяцыю даследчыкаў усходнееўрапейскага Сярэднявякоўя *Majestas*.

У канцы 1980-х гг., у час новых выклікаў і перабудовы палітычнай карты Цэнтральнай Еўропы, Я. Бак вяртаецца з Амерыкі на радзіму, у Будапешт. Ён прымае актыўны ўдзел у распрацоўцы гістарычнага профілю ў новаўтвораным Цэнтральна-Еўрапейскім універсітэце. Намаганнямі даследчыка пачалася трансляцыя актуальнай метадалогіі інтэлектуальнай гісторыі і міждысцыплінарнага дыскурсу ў прастору постсацыялістычнай Еўропы, у вакуум, пакінуты пасля масавага адыходу ад марксісцкай метадалогіі ў гістарычных даследаваннях, рэгіён, дзе адраджалася цікавасць да нацыянальных наратываў.

Праз навучанне студэнтаў, летнія школы і магістратуры Цэнтра даследаванняў Сярэднявякоўя Я. Бака прайшлі маладыя даследчыкі ўсяго Усходне-Еўрапейскага рэгіёна. Менавіта дзякуючы ім былі распрацаваны цэлыя напрамкі даследаванняў Сярэднявякоўя і сярэдневяковых крыніц. Вялікая хваля спецыялістаў з усяго рэгіёна ў 1990–2000-я гг. атрымала свой першы вопыт кампаратыўнай гісторыі і міждысцыплінарных даследаванняў. Такія ініцыятывы прафесара Я. Бака, як даследчыцкі праект параўнаўчай гісторыі сярэдневяковай знаці ці серыя выданняў «Цэнтральнаеўрапейскія сярэдневяковыя тэксты» (*Central European medieval texts*), становяцца ўзорам для іншых навуковых школ рэгіёна.

З 2007 г. Я. Бак адыходзіць ад актыўнага выкладання і займаецца стварэннем навуковай Цэнтральна-Еўрапейскай сеткі акадэмічных даследаванняў Сярэднявякоўя (*Medieval Central Europe Research Network*), паводле ўзору якіх павінны былі ўзнікнуць лакальныя даследчыцкія супольнасці новага тыпу.

Дзейнасць Я. Бака своеасаблівым чынам паўплывала на гістарычную навуковую прастору Беларусі і ўсяго нашага рэгіёна. Прафесара Я. Бака цікавіла гісторыя Вялікага Княства Літоўскага, а таксама роля і адлюстраванне гэтай дзяржавы ў сярэдневяковых крыніцах. Гісторык бачыў патэнцыял вывучэння як інтэлектуальнай прасторы ВКЛ – яго дзеячаў, візуальных вобразаў, асабістай гісторыі – так і мадэлі сацыяльных і палітычных паводзін. Не без уплыву Я. Бака з'явілася праца пра вобразы вялікага князя Вітаўта ў гістарычнай літаратуры Усходняй Еўропы, распачалася дыскусія пра тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага як культурнага памежжа Еўропы, было пастаўлена пытанне пра ВКЛ як сярэдневяковы правобраз дзяржавы імперскага тыпу.

Прафесар Я. Бак прымаў актыўны ўдзел у выдавецкіх праектах. Так, зборнік па метадалогіі і метадах даследаванняў Вялікага Княства Літоўскага, выдадзены ў 2003 г. беларускай групай даследчыкаў, не абышоўся без рэкамендацыйнага тэксту венгерскага гісторыка.

Звычайна ў аповедах пра выдатных навукоўцаў ствараецца акадэмічны вобраз, амаль пазбаўлены звычайных чалавечых рыс. Але падобнае апісанне немагчымае ў дачыненні да прафесара Я. Бака, бо яго асабістыя якасці значна ўплывалі і на ўспрыманне яго як прафесіянала. Гэты чалавек быў *настаўнікам* па Божым прызначэнні, і, магчыма, менавіта таму Бог адмераў яму працяглае і такое насычанае жыццё! Неад'емныя чалавечая годнасць, любоў і павага да вучняў, высакародная справядлівасць заўсёды адчуваліся ў Я. Баку, нават міжволі выклікалі да яго павагу і шанаванне з боку калег.

У навуковым асяроддзі адразу прызнаваліся аўтарытэт і шырокія гістарычныя веды Я. Бака. Безумоўна, ён быў *энцыклапедыстам*, што ўжо нячаста сустракаецца сярод сучасных спецыялістаў-гісторыкаў. У разуменні і асобных гістарычных сітуацый, і глабальных працэсаў з першых хвілін абмеркавання ўражвала шырыня геаграфічнага і гістарычнага падыходаў даследчыка. Прычым гэта заўсёды пралівала новае святло на пэўную сітуацыю. Янаш Бак вельмі лёгка аперыраваў прыкладамі з сярэдневяковай гісторыі як Заходняй, так і Цэнтральнай ды Усходняй Еўропы. Каб мець магчымасць удзельнічаць у навуковых дыскусіях, яго вучням і калегам з розных краін прыходзілася падрабязна чытаць венгерскую і румынскую гісторыю, назіраць за падзеямі Сярэднявякоўя на Балканах. А гэтыя

тэмы доўгі час не былі ў прыярытэце на гістарычных факультэтах нашага рэгіёна. Таму, калі малады навуковец упершыню аказваўся побач з прафесарам Я. Бакам, ён адразу адчуваў самы высокі навуковы ўзровень гісторыка, яго прафесійнасць у працы з маладым пакаленнем, і гэтага было дастаткова, каб прызнаць жаданне вучыцца ў яго і мець гонар лічыць яго сваім настаўнікам.

Янаш Бак меў няпросты лёс. На першы погляд вымушаная эміграцыя павінна была выхаваць у ім жорсткае непрыманне сацыялістычных ідэй і адпаведнага гістарычнага перыяду, які цяжка адбіўся на яго жыцці. Вяртанне ў Венгрыю стала магчымым толькі пасля дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне. Падавалася, Я. Бак мусіў выбраць палітычны бок, стаяць на абароне ідэй заходняй дэмакратыі і, як гэта нярэдка бывае, некрытычна ставіцца да сваіх ідэалаў. Менавіта такое ўражанне ўзнікла ў аднаго з аўтараў гэтых радкоў, выхаванага ў сацыялістычнай сістэме, якая прымушала стаяць толькі на адным баку ў сусветным змаганні. Таму ніколі не забыць думку Я. Бака, выказаную ім у прыватным абмеркаванні поспехаў у пашырэнні і аб’яднанні Еўрапейскага саюза: «Поспехі ёсць, але я памятаю, як мы будавалі сацыялістычны агульны лагер на чале з Савецкім Саюзам, а Венгрыя была блізкім саюзнікам. Ну, а цяпер мы будуем Еўрапейскі саюз, а Венгрыя з’яўляецца яго часткай». На вачах рассыпалася разуменне вечнасці, і замест яго паўставала гістарычнае асэнсаванне бясконцага палітычнага працэсу, які ніколі не спыніцца ў сваім этнаўтваральным руху. Такім чынам Я. Бак паказаў варты павагі прыклад крытычнага мыслення. Так настаўнік фарміраваў асобу даследчыка, напэўна, не менш, чым сваімі працамі. Гэта быў узор таго, як прафесійныя якасці перамагаюць персанальныя перажыванні.

Лёс навукоўца ў віры палітычных падзей натхняў Я. Бака на напісанне і ўдзел у напісанні цэлай серыі кніг, прысвечаных гісторыі яго радзімы, і перш за ўсё рэвалюцыйным падзеям у Венгрыі 1956 г.: «Венгерская рэвалюцыя 1956 г.: рэформы, паўстанне і рэпрэсіі (1953–1963)» (*The Hungarian Revolution of 1956: reform, revolt and repression, 1953–1963*), «Свабода і сацыялізм: працы лібертарыянскіх сацыялістаў у Венгрыі (1884–1919)» (*Liberty and socialism: writings of libertarian socialists in Hungry, 1884–1919*). З Я. Бакам магло здарыцца незвычайнае: запрошаны як гасцявы лектар, прафесар-медыявіст мог прачытаць лекцыю на тэму «Рэвалюцыя чалавечай годнасці: мэты і праграмы венгерскай рэвалюцыі 1956 г.», як гэта адбылося ў адным з расійскіх універсітэтаў.

У вялікай ступені менавіта дзякуючы прафесару Я. Баку Цэнтр даследаванняў Сярэдневякоўя Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта сфарміраваўся не толькі як навуковая адзінка самой венгерскай навукі, а стаў адным з аўтарытэтных асяродкаў падрыхтоўкі спецыялістаў з усяго Цэнтральна- і Усходне-Еўрапейскага рэгіёна. Любы навуковец ці аспірант, прыехаўшы на стажыроўку ў цэнтр, мог адчуць вельмі блізкія, амаль сямейныя адносіны паміж выкладчыкамі і навучэнцамі. Шмат залежала менавіта ад Я. Бака, які не толькі падабраў высокапрафесійны калектыў, але і з вялікай павагай ставіўся да людзей. Пры гэтым ён меў цвёрды характар і ўмеў задаволіць неабходныя адміністрацыйныя патрэбы пры арганізацыі навучальнага і навуковага працэсу.

Колькі маладых і ўжо не надта маладых даследчыкаў-медыявістаў прайшлі стажыроўкі пры Цэнтры даследаванняў Сярэдневякоўя Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта! Гэта прадэманстравала высокія здольнасці Я. Бака як *арганізатара*. Яшчэ працяглы час, ужо скончыўшы стажыроўку, маладыя даследчыкі падтрымлівалі цесныя сувязі са сваёй новай *alma mater*. Навуковая дасведчанасць і чалавечая годнасць проста насычалі атмасферу наўкол Я. Бака і дапамагалі ўзнімацца вышэй па прыступках да самаўдасканалення.

Колькі мог, прафесар Я. Бак асабіста вадзіў экскурсіі па Будапешце для гасцей Цэнтра даследаванняў Сярэдневякоўя Цэнтральна-Еўрапейскага ўніверсітэта. Гісторык мог параіць наведаць самыя далёкія і амаль невядомыя звычайным турыстам месцы ў сталіцы Венгрыі, калі госць меў спецыяльны інтарэс. Часам падавалася, што веды Я. Бака пра Будапешт таксама неабмежаваныя.

З вялікім гонарам адзначым, што ў 1998 г. прафесар Я. Бак наведаў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе прачытаў лекцыю па медыявістыцы і сустрэўся з аспірантамі. Было бачна, што ён з вялікай цікавасцю падчас экскурсійных вандровак прыглядаецца да гістарычных вобразаў упершыню ўбачанай краіны, пра гісторыю якой толькі чытаў. Я. Бак параўноўваў і ацэньваў, задаваў шмат пытанняў. Пры гэтым не менш яго цікавіла штодзённае жыццё жыхароў Мінска. Заўважалася, што ён ацэньвае і сучасны стан беларускага грамадства.

У 2020 г., пасля смерці прафесара Я. Бака ў Будапешце, Інстытутам гісторыі Венгерскай акадэміі навук сумесна з Венгерскім нацыянальным музеем была надрукавана манаграфія «Карона і каранацыя ў Венгрыі ў 1000–1916 гг.» (*Crown and coronation in Hungary 1000–1916 A. D.*) (аўтары – Янаш Бак і Геза Палфі (*Géza Pálffy*)), прысвечаная сімволіцы каралеўскіх інсігній Венгерскага каралеўства, паходжанню і сэнсу каранацыі. Што важна, гэта праца мае мэту папулярызацыі гісторыі Венгрыі, таму яна выйшла на англійскай мове. У лістападзе 2020 г. Цэнтр даследаванняў Сярэдневякоўя ў Цэнтральна-Еўрапейскім універсітэце абвясціў конкурс на атрыманне стыпендыі імя Янаша Бака. Такім чынам, ушанаванне памяці мэтра адбываецца ў форме папулеры-

зацыі творчай спадчыны гісторыка і пашырэння магчымасцей метадалагічнага ўдасканалення для маладых і сталых даследчыкаў Сярэдневякоўя нашай часткі Еўропы.

За апошняе дзесяцігоддзе Цэнтральная і Усходняя Еўропа страціла цэлы шэраг вядомых даследчыкаў эпохі Сярэдневякоўя і ранняга Новага часу, якія адраджалі мультыдысцыплінарную і кампаратыўную гісторыю рэгіёна ў 1990–2000-я гг. Яны зрабілі істотны ўклад у развіццё навуковых структур, інстытутаў, асацыяцый, але самае галоўнае – змаглі адчуць перазагрузку сваіх навуковых і дыдактычных інтарэсаў, накіраваць уласны патэнцыял і сілы цэлых навуковых супольнасцей на выхаванне новага пакалення даследчыкаў эпохі Сярэдневякоўя, узброеных новай метадалогіяй, пазбавіцца нягнуткай структуры навуковай школы мінулага стагоддзя, дзе адносіны паміж настаўнікам і вучнем амаль сакральныя. Я. Бак здолеў стаць *прафесарам-бацькам* для многіх вучняў некалькіх пакаленняў, дзе няма першых і апошніх. У гэтым праглядаецца новая веха ў антрапалогіі навукі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы XXI ст., шлях якой толькі пачынаецца.

***А. А. Прохараў***[1], ***А. У. Любы***[2]

[1]*Андрей Аркадьевич Прохоров* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории древнего мира и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Андрэй Аркадзьевіч Прохараў* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Andrei A. Prokhorov*, PhD (history), docent; head of the department of ancient and medieval history, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *andrei_prokhorov@mail.ru*

[2]*Андрей Владимирович Любый* – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси древнего времени и средних веков исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Андрэй Уладзіміравіч Любы* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Andrei V. Liuby*, PhD (history), docent; associate professor at the department of Belarus history of ancient time and Middle Ages, faculty of history, Belarusian State University.

E-mail: *liuby@bsu.by*